# ЭВАЛЮЦЫЯ ТЭАТРАЛЬНАГА ЗБУДАВАННЯ: ЯРУСНЫ ТЭАТР

***А. В. Пагоцкая,***
*выкладчык БДУКМ*

Напачатку сваёй гісторыі тэатр, які нарадзіўся з народных абрадаў і інсцэніровак царкоўных службаў, не меў свайго будынка. Першыя спецыяльныя тэатральныя будынкі з’явіліся ў Італіі ў 20-х гг. XVI ст. Тэатральныя прадстаўленні адбываліся і ў прыстасаваных памяшканнях. Будынак лічыцца спецыяльна пабудаваным, калі пры ўзвядзенні ў ім прадугледжваліся памяшканні для тэатра. Калі такія памяшканні не вызначаліся, будынак называецца прыстасаваным. На розных этапах развіцця тэатра ў краінах Еўропы назіраецца існаванне трох асноўных відаў тэатра: прыдворны, прыватны, публічны. І калі прыватныя і прыдворныя аматарскія тэатры месціліся ў асноўным у прыстасаваных памяшканнях, з’яўленне прафесійнага тэатра патрабавала спецыяльнага стацыянарнага будынка для паказу спектакляў для шырокай публікі.

Гісторыя спецыяльных будынкаў пачынаецца з тэатральных збудаванняў у часы Антычнасці. Яны з’явіліся ў Старажытнай Грэцыі ў VI ст. да н. э. і ўзводзіліся на схілах пагоркаў ці лагчын. Пры такім размяшчэнні памяншаліся затраты на будоўлю і дасягалася мэта даць гледачу лепшы агляд. Першыя збудаванні былі пад адкрытым небам у прыродным асяроддзі. Яны складаліся з трох частак: архестры – круглай пляцоўкі для выступлення хору і акцёраў, тэатрона (месцаў для гледачоў), які абкружаў архестру прыблізна на тры чвэрці яе перыметра, і скены – прыбудовы для пераапранання акцёраў і захавання тэатральнага рэквізіту. Устаноўка па акружнасці танцавальнай пляцоўкі сядзенняў для ганаровых гасцей і гараджан стала асновай для стварэння глядзельнай залы – партэра.Тэатры былі вельмі вялікімі, таму ўзнікала пытанне візуальнага і акустычнага паляпшэнняў – асноўных якасцей, якія ўлічваюцца пры ўзвядзенні тэатральнага збудавання. Прыкладам можа служыць тэатр у Сідзе (Анталія) і тэатр Дыяніса ў Афінах. Па сваёй архітэктуры, размяшчэнні месцаў для гледачоў антычны тэатр стаў правобразам заходнееўрапейскага тэатра, у якім вызначаюцца асноўныя элементы тэатральнага збудавання: сцэна і глядзельная зала.

Эпоха Сярэднявечча не спрыяла эвалюцыі тэатральнага будынка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на працягу тысячагоддзя ў Еўропе не з’явілася спецыяльных збудаванняў. А тыя, што засталіся ад часоў Антычнасці, прыходзілі ў заняпад і не выкарыстоўваліся па сваім прамым прызначэнні.

У эпоху Адраджэння перадавой краінай у галіне тэатральнай архітэктуры і сцэнічнай тэхнікі стала Італія. Менавіта тут узнік прафесійны тэатр і канчаткова склаліся прынцыпы закрытай сцэны – сцэны-каробкі. Новы тып закрытага тэатра створаны на аснове вывучэння антычнай тэатральнай архітэктуры. У 1511 г. быў апублікаваны трактат «Об архитектуре» (пер. Ф. А. Пятроўскага) Марка Вітрувія, дзе апісвалася будова грэчаскіх і рымскіх тэатраў. Крыху пазней у трактатах архітэктара Себасцьяна Серліа* паказана, як можна ўвасобіць прынцыпы Вітрувія з улікам патрабаванняў XVI ст. Акцёры ігралі толькі на прасцэніуме. Задняя частка сцэны не выкарыстоўвалася. Гэта схема стала асновай для першых спецыяльных тэатральных будынкаў з перспектыўнымі дэкарацыямі – у Ферары (1528) і ў Palazzo Porta ў Вічэнцы (1539); архітэктарам быў С. Серліа.

Услед за перабудовай сцэны пачаліся спробы змяненняў і ў самім будынку тэатра. Глядзельная зала паўкруглай ці эліпсападобнай формы ўяўляла сабой амфітэатр, які завяршаўся антычнай каланадай. Перад амфітэатрам знаходзілася паўкруглая архестра з месцамі для знатных асоб. Першым такім тэатрам, найбольш завершаным і дасканалым, стаў тэатр «Алімпіка» ў Вічэнцы, спраектаваны архітэктарам А. Паладыё, а скончаны яго вучнем В. Скамоццы ў 1585 г.

Перабудова сцэны прывяла і да іншых перамен у тэатры. Чым больш асвойвалася глыбіня, тым менш зручным станавіўся амфітэатр. Гэта парадзіла праблему планіроўкі тэатра. Задачай архітэктараў стала, па-першае, стварэнне ўмоў для ўмяшчальнасці большай колькасці гледачоў, па-другое, дакладнае раздзяленне публікі па саслоўных прыметах. Так з’явілася ідэя шмат’яруснага – рангавага тэатра, які прыйшоў на змену антычнаму амфітэатру.

Неабходна было паменшыць адлегласць ад гледача да сцэны. З ростам папулярнасці оперы звязваюць з’яўленне ў першай палове XVII ст. збудаванняў са шмат’ярусной глядзельнай залай, з лепшай акустыкай і добрай бачнасцю глыбіннай сцэны. Прынцып размяшчэння глядацкіх месцаў па вертыкалі быў узяты з самога жыцця, з традыцый народнага прадстаўлення. Пачынаючы з XVII ст. гэты прыём атрымаў права на існаванне ў архітэктуры

* Труды Себастьяна Серлио [1540–1560]. – URL: rutracker.org/forum/viewtopic.phg.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

італьянскага тэатра, які так і сталі называць «ярусны» – па прынцыпе размяшчэння месцаў для гледачоў, ці «рангавы» – чым ніжэй дастатак, тым вышэй ярус. Першым ярусным тэатрам у Еўропе стаў тэатр «Сан-Касіяна» ў Венецыі (1630–1637, архітэктар А. Сягеццы).

Ярусы з навясных балконаў павялічвалі колькасць месцаў для гледачоў пры ранейшай плошчы залы і служылі рэзанатарам гуку. Рады месцаў на ярусах спачатку былі суцэльныя, пазней падзелены перагародкамі на асобныя ячэйкі – ложы. Таму канец XVII – пачатак XVIII ст. адзначаны шэрагам эксперыментаў з пабудовай галерэй. Умовы эксплуатацыі тэатраў патрабавалі павелічэння будынка і ў вышыню для таго, каб умясціць большую колькасць ярусаў (іх магло быць да шасці). Апошні ярус тэатральнага балкона адрозніваўся ад папярэдніх тым, што ўяўляў сабой амфітэатр, раздзелены падоўжнымі і папярочнымі праходамі. Так з’явіліся месцы для непрывілеяванай публікі, гэтак званай галёркі.

Патрабаванні акустыкі прымусілі архітэктараў канчаткова адмовіцца ад прамавугольнай формы залы і замяніць яе на авальную, падкovападобную, якая звужаецца да партала сцэны. Прыходзілася ўлічваць не толькі акустычныя, але і візуальныя фактары. У гледачоў асабліва моцнае ўражанне выклікаў эфект перспектывы, таму ў XVII ст. назіраецца тэндэнцыя да паглыблення сцэны. З другой паловы XVII ст. італьянскі тып будынка – з авальнай у плане шмат’яруснай глядзельнай залай з лоджыямі – атрымаў сусветнае распаўсюджанне. Аўтарам такога італьянскага тыпу тэатральнага будынка называюць архітэктара К. Фантана (тэатр «Тардынона» ў Рыме, 1675). Далейшае развіццё італьянскага тыпу тэатра звязана галоўным чынам з удасканаленнем тэхнічнага абсталявання сцэны, увядзеннем дадатковых памяшканняў для абслугоўвання гледачоў (парадных лесвіц, фае, вестыбюля і г. д.).

Менавіта станаўленне тэатральнай архітэктуры прыпадае на апошнюю чвэрць XVIII ст., калі было ўзведзена некалькі тэатральных памяшканняў. Правобразам стаў італьянскі рангавы тэатр, які меў шмат’ярусныя ізаляваныя ложы, авальную ці падкowападобную залу, глыбокую сцэну, пляцоўку для аркестра перад сцэнай. Найбольш дасканалы ўзор італьянскага рангавага тэатра – будынак «Ла Скала» ў Мілане (1778, архітэктар Дж. П’ермарыні).

Пераважна ярусны італьянскі тып тэатра развіваўся ў Расіі з пятроўскіх часоў. Да італьянскага тыпу можна аднесці самыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

буйныя расійскія тэатры: Александрынскі тэатр у Санкт-Пецярбургу, Вялікі і Малы тэатры ў Маскве, Тэатр оперы і балета ў Адэсе і інш.

Пачатак тэатральнага будаўніцтва ў Рэчы Паспалітай звязаны з дзейнасцю маёнткавых прыватнаўласніцкіх тэатраў. З'яўленне тэатральнай архітэктуры на тэрыторыі сучаснай Беларусі прыпадае на апошнюю чвэрць XVIII ст.*, калі было ўзведзена некалькі тэатральных памяшканняў, правобразам якіх стаў італьянскі рангавы тэатр. Усе яны мелі шмат'ярусныя ізаляваныя ложы, авальную ці падкавападобную залу, глыбокую сцэну, пляцоўку для аркестра перад сцэнай.

Амаль у кожным палацы прыстасоўваліся ці спецыяльна будаваліся памяшканні для спектакляў. Узводзіліся яны, як правіла, італьянскімі дойлідамі. Іх аб'ёмы адрозніваліся масіўнасцю, дэкарыроўка фасадаў была сціплай і часам малавыразнай, галоўная ўвага надавалася рашэнню інтэр'ераў і магчымасцям сцэны. Майстэрства тэатральнага архітэктара праяўлялася менавіта ў стварэнні ўтульнай залы, добрай акустыкі, упрыгожванні ложаў, тэхнічным абсталяванні сцэны.

Тэатральныя збудаванні ў Ружанах, Гродне, Дзярэчыне, Слоніме, Мінску, якія дайшлі да нас у малюнках ці ў руінах, часткова або капітальна перабудаваныя, з'яўляюцца такімі ж дакументамі тэатральнай гісторыі Беларусі, як і драматычныя творы, праграмы ці ўспаміны сучаснікаў. У спалучэнні з літаратурнымі крыніцамі яны дазваляюць прасачыць агульную тапаграфію тэатральных помнікаў у асобных гарадах, тое, як прыстасоўваліся для тэатральных патрэб тыя ці іншыя будынкі. Параўнанне дайшоўшых да нас звестак у літаратуры, праектных планаў і тэатральных збудаванняў дазваляе сцвярджаць, што асноўным тыпам прыватнаўласніцкіх тэатраў быў тып будынка, кампактнага ў плане, з падкавападобнай залай, двух'яруснай сістэмай лож і адносна глыбокай сцэнай, на якой магчыма было размяшчаць перспектыўную кулісную дэкарацыю. Найбольш значныя будынкі былі добра абсталяваны ў Нясвіжы (1747–1748, архітэктар К. Ждановіч), Слуцку (1758), Слоніме (1777–1780, архітэктар І. Мараіна), Шклове (1780, архітэктар П. Барцанці; не ўсе захаваліся).

Да XIX ст. Віцебск, Гродна, Мінск, Магілёў мелі свае, хоць і не багатыя, тэатральныя традыцыі. Айчынныя і замежныя трупы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

* Першы спецыяльны тэатр на тэрыторыі Беларусі дзейнічаў у Нясвіжы з першай паловы XVIII ст.

рэгулярна наведвалі гэтыя гарады. Тэатральных памяшканняў было мала, спектаклі альбо канцэрты даваліся ў грамадскіх будынках: дваранскіх клубах, актавых залах гімназій, гарадскіх управах, а часам і ў прыватных дамах. Летам спектаклі ішлі ў гарадскіх садах у драўляных памяшканнях.

Ярусны тэатр адпавядаў усім патрабаванням як музычнага, так і драматычнага тэатра. Менавіта таму такі тып тэатральнага збудавання стаў асновай для Губернскага тэатра ў Мінску (зараз – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), пабудаванага ў 1890 г. паводле праекта архітэктараў К. Казлоўскага і К. Увядзенскага. Пазней праект быў нязначна зменены і захаваўся такім да XX ст. Тэатр меў трох’ярусную, з амфітэатрам, падковападобную форму залы на 550 месцаў. Партэр, ложы першага яруса і бельэтаж прызначаліся для заможнай публікі. Балкон узнімаўся прыступкамі ўгору, кааб лепей было відаць сцэну. Асобныя ложы былі спраектаваны для дырэктара і губернатара па абодва бакі партэра побач са сцэнай, насупраць сцэны на балконе на другім ярусе знаходзілася «царская ложа».

У мінскім гарадскім тэатры былі дапаможныя памяшканні: касавая зала, вестыбюль, лесвіцы, калідоры, кулуары, фае, гасціныя, курыльныя пакоі, буфет, а таксама адміністрацыйныя і службовыя памяшканні. Планы не прадугледжвалі асобных месцаў для гардэроба, і гледачы пакідалі вопратку ў калідорах, якія размяшчаліся па перыметры залы, на ўсіх ярусах. З калідора другога паверха траплялі ў шыкоўна аформленае фае, дзе быў буфет; у антрактах тут іграла музыка і публіка танцавала.

Сцэнічная пляцоўка адкрывалася вялікім праёмам – партальнай аркай. Большая частка аркестра знаходзілася пад сцэнай, а ў залу выступала аркестравая яма. Галоўны, цэнтральны праход ішоў уздоўж восі глядзельнай залы; былі і дадатковыя выхады па баках. Падлога ў зале магла падымацца дамкратамі да ўзроўню сцэны, і тэатральная зала рабіласямесцам для баляў і маскарадаў.

У XX ст. тэатр двойчы мяняў свой выгляд: у 1949 г. па праекце архітэктара Р. Заборскага і ў 1960-я гг. пад кіраўніцтвам архітэктара А. Духана адбыліся дзве буйнамаштабныя рэстаўрацыі. Усе гэтыя пераўтварэнні прывялі да таго, што тэатр згубіў свой гістарычны выгляд.

У 2010–2012 гг. адбылася рэканструкцыя будынка. Тэатру вярнулі яго першапачатковы выгляд, якім ён быў у 1890 г. З другога паверха фасада знялі нарошчаныя ў 1960-я гг. канструкцыі, аднавілі ляпніну і аркі.

Інтэр’ер тэатра таксама змяніўся. Былі ўзноўлены ўнутраны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэкор у бірузова-блакітным колеры, ляпніна, дзверы, мэбля, каміны. Зноў з’явілася фае для гледачоў, якое падчас рэканструкцый у сярэдзіне ХХ ст. было заменена рэпетыцыйнай залай, кабінетамі адміністрацыі, архівамі. Яно вядзе да лож. Усе ложы аддзелены адна ад адной сценкамі так, як гэта было ў імперскіх тэатрах.

У галоўнай зале палепшылася бачнасць з усіх глядацкіх месцаў: колькасць месцаў паменшылася, але яны размясціліся адно над другім, ступеньчата. На вялікі жаль, не атрымалася аднавіць пад’ём падлогі глядзельнай залы. Гэта функцыя была ўнікальнай для тэатра і ўвогуле для тэатральных збудаванняў Беларусі.

Не прыйшлося аднаўляць і сістэму паваротнага кола на сцэне. На месца механізмаў, якія даўно састарэлі, прыйшлі новыя тэхналогіі: люкі-правалы, праз якія артысты з’яўляюцца і знікаюць, пляцоўкі на радыёкіраванні, якія рухаюцца па сцэне і ствараюць любую кампазіцыю. Сама сцэна павялічылася ўглыб на тры метры, каб дадаць прасторы для рэжысёра і акцёраў, а таксама з’явіліся яшчэ тры рэпетыцыйныя залы, адна з іх паўтарае памеры сцэны.

Нарэшце, рэканструкцыя была б няпоўнай, каб задаволілася толькі аднаўленнем першапачатковага выгляду тэатра, таму яна закранула дадатковыя прыбудовы; тэатр аснашчаны сучасным абсталяваннем.

Такім чынам, з’явіўшыся ў пачатку XVII ст., ярусны тэатр стаў найбольш дасканалым тыпам будынка, які адпавядае асноўным патрабаванням тэатральнага відовішча: добрыя бачнасць і чутнасць. На працягу сваёй гісторыі ён значна не змяніўся, захаваў прынцып вертыкальнага размяшчэння гледачоў і глыбокую сцэну, пашырыўся амаль ва ўсіх краінах з еўрапейскай культурай і працягвае сваё далейшае існаванне ў новых умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ